

# БУДЗЬ З НАМІ Ў РОДНЫМ КРАІ



Выпуск № 5 (11)

*Газета для вучняў, настаўнікаў і бацькоў*

# Што нас чакае ў III чвэрці?

**1. Агульнарэспубліканскі суботнік**

**2. Конкурсы “Лінгвистенок” (англ. язык), “Кентаврик” (история), “Олимпионок” (физкультура)**

**3. Алімпіяды для VIII-IX класаў**

**4. Свята Дзень Вялікай Перамогі**

**5. Разнастайныя конкурсы і мерапрыемствы**

**6. Вынікі конкурса “Лепшы клас года”**

**7. Добры настрой і прыемныя падзеі**













# ВЫНІКІ III ЧВЭРЦІ

Вось і пачалася IV чвэрць, але хацелася б звярнуць увагу на вынікі папярэдняй. На працягу ўсёй самай доўгай чвэрці вучні разам з настаўнікамі шмат працавалі. У кагосьці вынікі лепшыя, а ў каго і горшыя. Нягледзячы ні на што мінулая чвэрць была напоўнена падзеямі школьнага жыцця.

## Па выніках III чвэрці ў нашай школе 4 **выдатнікі**.

| | | | |
|---|---|---|---|
|  |  |  |  |
| **Глушонак Мікіта, III клас** | **Барташэвіч Данііл, IV клас** | **Крывеня Мілана, IV клас** | **Квітун Аляксандра, V клас** |

## Нашы надзеі

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
|  |  |  |  |  |  |  |
| Грынцэвіч Аляксандра, III клас | Рахатка Анастасія, III клас | Скібіна Паліна, III клас | Кіянка Ульяна, IV клас | Гаўрылюк Алена, V клас | Скерсь Святлана, V клас | Копаць Ганна, VI клас |
|  |  |  |  |  |  |  |
| Мілюшкевіч Антоній, VI клас | Мамедава Рэната, VII клас | Гаўрылюк Анастасія, VIII клас | Навагран Таццяна, VIII клас | Боднар Ганна, IX клас | Навасад Яўгенія, IX клас | Гур'ян Анастасія, X клас |

# ПАДЗЕІ ЧВЭРЦІ

21-22 сакавіка прайшлі алімпіяды для вучняў IV-VII класаў. Нашу школу на раённай аліпіяде прадстаўлялі 11 вучняў (Барташэвіч Данііл, Крывеня Мілана, Квітун Аляксандра, Гаўрылюк Алена, Наваграм Аляксандр, Мілюшкевіч Антоній, Копаць Ганна, Мамедава Рэната, Капытнік Дзяніс, Сазонава Анастасія, Стэцэвіч Ірына). Нажаль не ўсе вучні атрымалі перамогу пад час алімпіяды. Але ўсё ж такі сярод вучняў нашай школы ёсць і пераможцы. **Віншуем іх!!!**

**Крывеня Мілана**, вучаніца IV класа, - I месца па беларускай мове;

**Наваграм Аляксандр**, вучань V класа, - III месца па беларускай мове;

**Мілюшкевіч Антоній**, вучань VI класа, - III месца па беларускай мове;

**Копаць Ганна**, вучаніца VI класа, - II месца па беларускай мове;

**Мамедава Рэната**, вучаніца VII класа, - III месца па беларускай мове.

****************************************

## Канікулы з карысцю

З 27 сакавіка па 1 красавіка ў школе працаваў прышкольны лагер “Сонейка”. Лагер наведвалі 32 вучні нашай школы. Яны прынялі ўдзел у розных мерапрыемствах: гульнях, віктарынах, экскурсіях, сустрэчах.



# АКЦЫЯ “ЧЫСТЫ ЛЕС”

Прырода… Яна такая цудоўная… Найбольш ярка ўсю яе прыгажосць можна адчуць толькі дакрануўшыся да яе, застаўшыся з ёй сам-насам. А дзе гэта можна зрабіць? Адказ вельмі просты: можна гэта зрабіць у цудоўнай і прыгожай вёсцы Мінойты: на бяскрайніх палях вакол яе, у лясах, напоўненых галасамі розных птушак. Але каб усё гэта заставалася прыгожым і радавала вока чалавека яшчэ не адзін год, неабходна дапамагаць прыродзе.

Метавіта таму вучні Мінойтаўскай школы, сярод якіх былі піянеры і члены грамадскага аб’яднання “БРСМ”, восьмага красавіка прынялі ўдзел у добраахвотнай акцыі “Чысты лес” у рамках “Тыдня лесу - 2017”.

Мэта гэтай акцыі: прыцягнуць увагу ўсіх да неабходнасці ашчадна ставіцца да лесу, не засмечваць яго. У рамках акцыі выканана ачыстка лесу ад смецця.

Вучні школы праявілі актыўнасць у ходзе акцыі, паказалі іншым прыклад адносінаў да галоўнага прыроднага багацця краіны.

Чысціня і парадак у лесе залежыць ад кожнага з нас. Мы хочам, каб лес быў чыстым і прыгожым, каб мы маглі гуляць па лесе, дыхаць свежым паветрам і любавацца прыгажосцю нашай прыроды.







## Дзякуй вучням за актыўнасць!


| | | | |
|---|---|---|---|
| **Будзь з намі ў родным краі** *Газета для вучняў, настаўнікаў і бацькоў* | **Заснавальнік –** Мінойтаўская СШ **Галоўны рэдактар –** Хіневіч Н.М. | **Афармленне:** Савет старшакласнікаў | **Адрас рэдакцыі:** в.Мінойты, вул.Чырвонаармейская, 3, тэл. 597337 |